

«УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЛЮБОВІ»: НА СЦЭНЕ І Ў ЖЫЦЦІ 9

ЧАКАЕМ У ГОСЦІ ЧОРНАГА ТРУСА 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 СНЕЖНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 256 (29878)


## КОРАТКА

• **Гандлёвыя сеткі працягваюць выдзяляць зніжку 10 працэнтаў на шэраг тавараў для ўразлівых катэгорый насельніцтва.**

• Найлепшы макет вонкавай рэкламы аб праекце «Здаровыя гарады і пасёлкі» абяруць у Беларусі.

• **З пачатку года сельскагаспадарчыя арганізацыі Мінскай вобласці выпусцілі 2 млн тон малака.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Імпартазамяшчэнне стала ключавым механізмам і інструментам процідзеяння санкцыйнаму ціску, драйверам прамысловай вытворчасці. Акрамя таго, яно садзейнічае зніжэнню імпарту і паляпшэнню нашага плацежнага балансу. Па выніках года будзе выраблена імпартазамяшчальнай прадукцыі на суму каля $25 млрд — гэта на 10 працэнтаў больш, чым летась. 50 працэнтаў будзе накіравана на экспарт. Гэта даволі добрыя паказчыкі. Развіваецца інтэграцыя. Сфарміравана каля 20 праектаў. Але мы бачым вялікія рэзервы ў гэтым кірунку. Таксама асаблівая ўвага ўдзяляецца лакалізацыі. Гэта павелічэнне тэхналагічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі і ў кааперацыі з расійскімі вытворцамі. Прыярытэтным з'яўляецца і выкарыстанне мясцовых сыравінных рэсурсаў».*


ISSN 1990 — 763X

22256>


З першых вуснаў

# «НАЙЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ НАШЫХ ПРОДКАЎ ЖЫВУЦЬ У КОЖНЫМ НОВЫМ ПАКАЛЕННІ»

**У Палацы Незалежнасці на мажорнай ноце правялі стары год. У Рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прайшоў традыцыйны навагодні баль для моладзі. Сцэны палаца звычайна бачаць дарослых сур'ёзных людзей у дзелавых касцюмах. Але гэтым вечарам палац зіхацеў усмешкамі дзяўчат у бальных сукенках, якіх суправаджалі сур'ёзныя малады людзі ў смокінгах і фраках. Усяго ў Палацы Незалежнасці сабраліся 320 таленавітых маладых людзей з усёй краіны. Білетам на гэтае свята для іх сталі актыўны ўдзел у навуковым і грамадскім жыцці сваёй навучальнай установы, плённая навуковая праца, спартыўныя і творчыя вынікі.**



Адна з традыцый навагодняга балю — дрэс-код. Незамужнія юныя ўдзельніцы абавязкова ў белым. Усе астатнія дамы — у бэжавых, персікавых, крэмавых сукенках. Мужчыны — традыцыйна ў фраках і смокінгах. Танец адкрыцця — паланэз.

Традыцыйна ўдзельнікаў навагодняга балю прывітаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Вельмі сімвалічна, што мы завяршаем 2022-і — Год гістарычнай памяці — на такой яркай і пазітыўнай ноце», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ў нашай гісторыі было шмат пераломных падзей — і драматычных, і лёсавызначальных. Па словах Прэзідэнта, у адыходзячым годзе да іх была прыкавана ўся ўвага экспертаў, журналістаў, палітыкаў, усіх людзей Беларусі. Абмяркоўвалі, спрачаліся, аднаўлялі гістарычную справядлівасць.

«Але сённяшні вечар мы прысвячаем культурнай спадчыне, створанай нашымі продкамі, нягледзячы на войны, нягоды і іншыя выпрабаванні. Іх было нямала. Прысвячаем яго стваральнай прыгажосці, якая ў цяжкія часы давала надзею на будучыню. Мы бачым яе ў архітэктурных і літаратурных творах, жывапісных і музычных шэдэўрах, у той жа бальнай традыцыі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — За гады нашай незалежнасці, а іншымі словамі — за той час, пакуль вы раслі і сталелі, шмат зроблена, каб захаваць помнікі нашага старажытнага і сучаснага мастацтва, памяць нашых землякоў, якія заслужылі сусветнае прызнанне працай і талентам».



Фота БелТА.

Беларускі лідар заўважыў, што нам сапраўды ёсць чым і кім ганарыцца. Звяртаючыся да ўдзельнікаў балю, ён сказаў, што яны годна працягваюць нашу незвычайна багатую і яркую гісторыю. Працягваюць поспехамі ў вучобе, творчасці, спорце. Многія знаходзяць час для валанцёрскай дзейнасці. Па поклічы сэрца, абсалютна бескарысліва дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоў, адзінокім пажылым людзям, інвалідам. А хтосьці клапоціцца пра братоў нашых меншых.

«Усё гэта гаворыць аб тым, што найлепшыя традыцыі нашых старажытных продкаў, якія ніколі не пакідалі ў бядзе сваіх блізкіх, жывуць у кожным новым пакаленні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Спажывец

# САМЫ НАВАГОДНІ «ВІТАМІН»

### Усё, што вы не ведалі пра мандарыны



**Мандарыны ў наш час на прылаўках практычна круглы год (першыя новага ўраджаю з'яўляюцца ў продажы ўжо летам). Але становяцца яны абавязковым пунктам меню сярэднестатыстычнай беларускай сям'і па-ранейшаму ў асноўным зімой. Бліжэй да Новага года мандарыны ёсць ужо практычна ў кожным спісе, з якім пакупнік адпраўляецца ў краму ці на рынак.**

СТАР. 8

Навука

# ЦІ ЗОЙМУЦЬ МЕСЦА ХВАЁВЫХ ЛЯСОЎ ДУБРОВЫ?

### Пацяпленне — не міф, а факт, які біёлагі зафіксавалі інструментальнымі метадамі

**Вучоныя Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з расійскімі калегамі з Інстытута праблем экалогіі і эвалюцыі РАН упершыню пабудавалі звышвекавыя дэндрахраналагічныя шкалы, якія адлюстроўваюць дынаміку кліматычных фактараў і гаспадарчай дзейнасці ў нашым рэгіёне больш як дзве тысячы гадоў.**

**Пра тое, якія задачы вырашаюць дэндрахраналагічныя даследаванні, наколькі каштоўную інфармацыю можна з іх дапамогай атрымаць і ў якіх сферах яе выкарыстоўваць, «Звяздзе» расказалі загадчык лабараторыі праблем экалогіі лесу і дэндрахраналогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі, кандыдат біялагічных навук Аляксандр ПУГАЧЭЎСКІ і навуковы супрацоўнік той жа лабараторыі Наталля КНЫШ.**

СТАР. 7

# «НАЙЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ НАШЫХ ПРОДКАЎ ЖЫВУЦЬ У КОЖНЫМ НОВЫМ ПАКАЛЕННІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт адзначыў, што ў бальны вечар Палац Незалежнасці належыць маладым людзям. «Не раз казаў і паўтару, што ён адчынены для ўсіх, хто імкнецца сумленна і добрасумленна служыць сваёй Айчыне і народу. Тут ствараецца гісторыя сучаснай Беларусі, прымаюцца стратэгічна важныя рашэнні. У іх абмеркаванні ўдзельнічаюць людзі, якія не баяцца браць на сябе адказнасць за лёс краіны. І наша сённяшняе свята — гэта таксама старонка гісторыі нашай Радзімы», — сказаў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што ў гэтай зале прысутнічаюць курсанты — будучыя афіцэры, якія ўжо могуць і самі распавесці пра абавязак служыць Айчыне, пра патрыятызм. Гэта ў іх у крыві, раз абралі такую высакародную прафесію — Радзіму абараняць.

«Час сёння патрабуе ад кожнага з нас думаць не толькі аб сабе, але і аб краіне, як бы пафасна гэта ні гучала. Незалежна ад таго, носім мы пагоны ці не, працуем у дзяржустанове ці пішам карціны», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. «Напярэдадні Новага года я хачу вам пажадаць захаваць усё найлепшае, што ёсць у нашым жыцці. Будзьце разважлівымі, вывучайце розныя погляды на жыццё, розныя меркаванні, але рабіце самі свае высновы. Рухайцеся да вызначаных мэт імкліва, але не забывайце азірацца назад. У шматвяковай гісторыі беларускай зямлі вы заўсёды знойдзеце мудрыя парады, якія дапамогуць прыняць правільныя рашэнні ў вашым лёсе, у лёсе Беларусі», — сказаў Прэзідэнт.

«Я хачу, каб гэта мерапрыемства было яркай старонкай у гісторыі вашага жыцця. Будзьце заўсёды здаровыя і шчаслівыя. Няхай будуць вашыя родныя і блізкія таксама здаровыя і шчаслівыя. Няхай вочы ў іх свецяцца радасцю, гледзячы на вас. Са святам вас!» — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

## «ЯК У КАЗЦЫ...»

Удзельнікі навагодняга балю падзяліліся сваімі ўражаннямі ад гэтага незвычайнага вечара. «Каб апынуцца тут, было праведзена шмат работы, год быў вельмі прадукцыйны. Сама я з'яўляюся старшынёй Каардынацыйнага студэнцкага савета ўніверсітэта. Шмат часу ішло і на вучобу, і на грамадскае жыццё. І вельмі прыемна, што нас заахвочваюць, гэта вельмі каштоўна. Апынуцца тут — як апынуцца ў казцы, гэта незабыўныя эмоцыі, якія я буду памятаць усё жыццё. І калі трапляеш сюды, з'яўляецца яшчэ больш сіл на новыя здзяйсненні», — падзялілася Вольга Мацука, студэнтка Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта.

«Я чула аб навагоднім балі і заўсёды марыла сюды трапіць, і вось мара спраўдзілася. Аддалі шмат часу і сіл на падрыхтоўку танцаў. Але гэта таго варта», — адзначыла Юлія Макарэвіч, студэнтка Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта.

«Не адразу прыйшло ўсведамленне, наколькі ўсё сапраўды маштабна. Мне да гэтага часу не верыцца, што я тут знаходжуся. І дзякую ўсім, хто ў мяне паверыў і дапамог стаць часткай усяго гэтага», — падзяліўся Данііл Домрачаў, студэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

# Каб эканоміка развівалася, а дзеці былі шчаслівыя

### У ходзе рабочай паездкі на Брэстчыну Наталля Качанава правяла нараду з кіраўнікамі раёнаў і прыняла ўдзел у дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці»

**У Бярозе прайшла сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з кіраўнікамі выканаўчых органаў улады і старшынямі гар- і райсаветаў Брэстчыны. У нарадзе ўдзельнічалі таксама старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Вакульчык, сенатары ад Брэстчыны Юрый Наркевіч, Рыгор Пратасавіцкі, Анатоль Шалтанюк.**

Спікер верхняй палаты парламента адразу заклікала ўдзельнікаў сустрэчы да дыялогу і выказала спадзяванне, што сустрэча будзе плённай і канструктыўнай.

— Мы ўжо правялі такія сустрэчы ў шэрагу рэгіёнаў краіны. На іх найперш гаворым пра вынікі года, пра тое, як спрацавалі рэгіёны ў плане сацыяльна-эканамічнага развіцця, — абазначыла Наталля Качанава тэмы размовы. — Эканоміка — галава ўсяму. Ад стану эканомікі залежыць далейшае развіццё краіны. Сёння мы канстатуем, што Брэстчына — у лідарах па выкананні паказчыка па валавым рэгіянальным прадукце, звяртаем увагу на рэзервы і недахопы. Мы падводзім вынікі і вызначаем ключавыя задачы на новы год.

Наталля Качанава адзначыла, што лічыць Брэстчыну перспектыўным рэгіёнам, падкрэсліла яе поспехі ў сельскай гаспадарцы і ролю ў стварэнні харчовай бяспекі краіны. «Вобласць пастаянна прырастае новымі праектамі. Кіраўніцтва рэгіёна робіць усё, каб пастаўленыя задачы выконваліся на належным узроўні».

Старшыня Савета Рэспублікі заклікала прысутных выказаць прапановы наконт развіцця і ўдасканалення заканадаўства, калі такія маюцца ў раёнах. Заканатворчасць таксама была ў парадку дня гэтай сустрэчы.

— Пры Савеце Рэспублікі працуе экспертны савет, — нагадала спікер верхняй палаты. — Мы разглядаем нарматыўныя прававыя акты. Каб даць экспертную ацэнку своечасовасці прыняцця, уздзеянню на грамадства, эфектыўнасці далейшай работы закона. Каб законы былі выверанымі, ішлі ад жыцця, мы раімся са спецыялістамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікамі не толькі рэспубліканскіх структур, але і мясцовай улады.

У ходзе рабочай паездкі Наталля Качанава пацікавілася работай па аптымізацыі сельскіх Саветаў. Старшыня Бярозаўскага райсавета Данута Гукіна расказала, як прайшла гэта работа, паведаміла аб некаторых праектах і напрацоўках мясцовай улады раёна.

У другой палове дня Наталля Качанава пабывала на навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ў Бярозаўскім раённым цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Для дзяцей з асаблівасцямі развіцця зладзілі вясёлае свята з Дзедам Марозам і Снягуркай, з казачнымі героямі.

Госці, вядома, прыйшлі з падарункамі. Старшыня Савета Рэспублікі ўручыла сертыфікат на 30 тысяч рублёў. За іх плануюць абсталяваць сэнсарную залу. Кіраўнік Брэстчыны Юрый Шулейка ўручыў дзіцячай установе тэлевізар. А старшыня абласвета Юрый Наркевіч падарыў інтэрактыўнае люстэрка, якое неабходна ў рабоце.



Фота БелТА.

Наталля Качанава вельмі цёпла павіншавала калектыў цэнтра, падзякавала педагогам і супрацоўнікам за іх нялёгкую працу. У размове з журналістамі спікер адзначыла, што за многія гады гэтая акцыя стала добрай, прыгожай традыцыяй:

— У нашай краіне вельмі многа робіцца для таго, каб кожнае дзіця адчувала сябе шчаслівым. Гэта шчасце — дарыць хлопчыкам і дзяўчынкам сваё цяпло і падарункі. Таму мы з вялікай радасцю прыходзім у такія ўстановы. Хочацца, каб дзеці былі жывыя і здаровыя, каб жылі ў сем'ях, але так бывае не заўсёды, і тады дзяржава абавязкова падстаўляе плячо, аказвае падтрымку. А ў святочныя дні важна пажадаць усім дзецям нашай краіны быць здаровымі і шчаслівымі, жыць у мірнай краіне.

Разам з дзецьмі госці вадзілі карагод вакол ёлкі, а затым кожны з выхаванцаў установы атрымаў падарунак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*г. Бяроза.*

Вынікі года

# ДАЛЕЙ — БОЛЕЙ

**У Віцебску прайшла выніковая сесія абласнога Савета дэпутатаў. Аб дасягненнях паўночнага рэгіёна ў гэтым годзе і планах на будучы расказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Нягледзячы на нялёгкі год, калі кожны рэгіён нашай краіны сутыкнуўся з санкцыйным ціскам, Віцебшчына дасягнула выдатных вяршынь у некаторых галінах эканомікі. Паўночны рэгіён у 2022 годзе выйшаў на лідзіруючыя пазіцыі па экспарце, рознічным і аптовым гандлі, заняў другое месца па валавым рэгіянальным прадукце, саступіўшы толькі Брэсцкай вобласці.

«Год быў нялёгкім па прычынах узмацнення санкцыйнага ціску, з-за абмежаванняў па знешнім контуры, няпростай сітуацыі ў краіне ў прамысловай і сельскагаспадарчай сферах з-за таго, што не было паставак сыравіны, былі разарваныя многія лагістычныя ланцужкі. Нягледзячы на нагнятальную абстаноўку, нам сумесна ўдалося з мінімальнымі стратамі перайсці гэтую мяжу. Калі ўсе вынікі пералічваць, то гэта вельмі ёміста. Гаворачы зразумелымі тэрмінамі, скажу, што мы сталі першымі па экспарце, рознічным і аптовым тавараабароце. Мы сталі другімі па ВРП, а гэта адзін з самых значных маркераў, наперадзе толькі Брэсцкая вобласць. Акрамя таго, мы занялі трэцяе месца па аб'ёме імпартазамяшчальнай прадукцыі», — падвёў вынікі адыходзячага года кіраўнік вобласці.

Гаворачы аб планах на наступны год, Аляксандр Субоцін адзначыў, што ў 2023-м будзе працягвацца рэалізацыя праграм, распачатых сёлета. Сярод іх перавага аддаецца мерапрыемствам па Указе № 70 «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці». «Мы ўжо два гады адпрацавалі па



Фота БелТА.

ім, сёння ўжо бачна, дзе ёсць недахопы, што можна выправіць. Рэгіён запусціў фарміраванне біятэхналагічнага кластара — гэта тое, што патрабуе кіраўнік дзяржавы: каб у кожнай вобласці было па 1-2 такіх буйных праектаў. Ён пачне рэалізоўвацца ў 2023 годзе. Вядома, мноства цікавых і карысных праектаў будуць рэалізаваны ў сацыяльнай і культурнай сферах».

Што датычыцца фарміравання бюджэту Віцебскай вобласці, то ў наступным годзе ўпершыню з яго будуць накіроўваць сродкі на фінансаванне грамадзянскіх ініцыятыў: гэта можа быць добраўпарадкаванне тэрыторыі, будаўніцтва або рамонт сацыяльных аб'ектаў. Па словах **начальніка галоўнага фінансавага ўпраўлення Віцебскага аблвыканкама Іны ЮШЧАНКІ,** бюджэт паўночнага рэгіёна на наступны год захавае сацыяльны кірунак, у 2022 годзе вобласць атрымала даходы звыш запланаваных, нягледзячы на складаную сітуацыю вакол і санкцыйны ціск.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Ігар КАРПЕНКА:

# «Улетку мы ўвойдзем у актыўную фазу падрыхтоўкі адзінага дня галасавання»

**Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка правёў адкрыты дыялог з актывам БРСМ. Падчас сустрэчы, якая прайшла пад назвай «Моладзь і выбары: формула адказнасці», удзельнікаў праінфармавалі аб змяненнях Выбарчага кодэкса, расказалі аб адзіным дні галасавання і патрабаваннях для грамадзян, якія маюць намер вылучацца кандыдатамі ў дэпутаты і на пасаду Прэзідэнта краіны.**

Старшыня ЦВК нагадаў, што навацыі ў Выбарчы кодэкс прыняты ўжо ў першым чытанні Палатай прадстаўнікоў:

— Спадзяюся, у найбліжэйшы час законапраект будзе прыняты ў другім чытанні, адобраны Саветам Рэспублікі. Затым Прэзідэнт павінен падпісаць заканадаўчы акт, каб ён уступіў у законную сілу. Спадзяёмся, што ў студзені гэты працэс завершыцца. Улетку 2023 года мы ўвойдзем у актыўную фазу падрыхтоўкі адзінага дня галасавання. Навацыямі прадугледжваецца, што ўжо восенню мы будзем актыўна займацца ўстанаўленнем колькасці выбарчых акруг, фарміраваннем акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў. Гэта значыць, яшчэ да моманту выхаду ўказа аб назначэнні выбараў у адзіны дзень галасавання гэты працэс будзе ісці, — адзначыў Ігар Карпенка.

Пасля прыняцця Выбарчага кодэкса будуць распрацоўвацца метадычныя рэкамендацыі, дадаў старшыня ЦВК.

Звяртаючыся да тэмы змяненняў, якія былі ўнесены ў Выбарчы кодэкс, Ігар Карпенка адзначыў, што навелы ўмоўна падзяляюцца на тры катэгорыі:

— У першую групу ўвайшлі тыя, якія датычацца адзінага дня галасавання і новых дадатковых паўнамоцтваў ЦВК, у прыватнасці, удзел у арганізацыі асветніцкай дзейнасці нашых грамадзян у пытаннях выбарчага права, тэхналогій і іншага. Другі блок пытанняў звязаны са з'яўленнем новага інстытута — УНС. Акрамя таго, з'явіўся шэраг заканадаўчых актаў, якія датычацца грамадзянскай супольнасці: былі ўнесены змяненні ў законы аб палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях. Дастаткова вялікі блок быў звязаны з аналізам практыкі прымянення выбарчага заканадаўства: нормы былі падкарэкціраваны, зыходзячы з балансіроўкі інтарэсаў дзяржавы і грамадства, — адзначыў Ігар Карпенка.

Удзел моладзі ў фарміраванні парадку дня, абмеркаванне заканадаўчых актаў і абмен меркаваннямі вельмі важныя для пабудовы будучыні, бо менавіта маладым людзям жыць і развівацца ва ўмовах работы новых нарматыўна-прававых актаў, якія прыводзяцца ў адпаведнасць з нашай Канстытуцыяй, адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

Ён нагадаў, што 2023 год стане важным для арганізацыі — у ім будуць адзначацца адразу дзве круглыя даты: 105 гадоў утварэння камсамольскай арганізацыі і 65 гадоў студатрадаўскаму руху.

— Гэтыя даты стануць нагодай для прыцягнення моладзі, вакол іх акумулюецца наша праграмная дзейнасць. Зразумела, адбудуцца знакавыя мерапрыемствы, у тым ліку ўшанаванне маладых работнікаў і ўключэнне ў працэс пярвічных арганізацый. Гэта чарговы раз паспрыяе аб'яднанню нашага грамадства і захавае традыцыі пераемнасці, — падкрэсліў Аляксандр Лук'янаў.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# Перадкнавагоднія віншаванні Кнізе

**45 гадоў адсвяткавала адна з найбольш вядомых кнігарань краіны — Дом кнігі «Светач»**

**Павіншаваць калектыў руплівых працаўнікоў на кніжнай ніве прыйшлі дзяржаўныя і прыватныя кнігавыдаўцы, калегі па сістэме кнігагандлю, пісьменнікі, грамадскія дзеячы. Кветкі, падарункі, цёплыя віншавальныя словы не заміналі рабоце кнігарні. Як і ў звычайныя дні, учора пакупнікі па-ранейшаму наведвалі залы «Светача», выбіралі патрэбную літаратуру. А яшчэ і ўчора, і ў іншыя перадсвяточныя дні ў кнігарні ладзіліся розныя імпрэзы, аўтограф-сесіі. Нават музыка і спевы гучалі. Напрыклад, у выкананні народнага артыста Беларусі, вядомага на ўсёй постсавецкай прасторы кампазітара Эдуарда Ханка. Ён, дарэчы, — яшчэ і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар многіх кніг, якія прысвечаны сакрэтам айчыннай і сусветнай эстрады.**


Фота sb.by

Адкрыў святкаванні генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір МАТУСЕВІЧ. З урачыстым прывітальным словам выступіў намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ. Разважаючы пра ролю кнігі ў сучасным грамадстве, ён зазначыў, што многае ў зносінах з чытачом і пакупніком залежыць і ад таго, наколькі ўніклівы да зместу кнігі падыходзяць самі работнікі кніжнага гандлю, наколькі здольны расказаць пра адметнасці таго ці іншага выдання. Пра сакральнасць прасторы кнігарні, пра тое, што на сустрэчу з навінкамі кнігавыдання варта ісці ўсёй сям'ёй, пра выхаваўчую ролю кнігі на святочнай імпрэзе гаварыў старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ.

Павіншаваць калектыў «Светача» з юбілеем прыйшлі і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», празаік, паэт, літаратурны крытык Алесь БАДАК, генеральны дырэктар Паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа Ігар МАЛАНЯК, дырэктар выдавецтва «Народная асвета» Вікторыя КАЛІСТРАТАВА, дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН і шмат хто яшчэ.

Юбілейная імпрэза хоць і завяршылася, у «Светачы» з нагоды 45-годдзя і ў студзені наступнага года пройдзе яшчэ нямала сустрэч аўтараў кніг, выдаўцоў з чытачамі і пакупнікамі. Так што спяшайцеся ў «Светач» па адрасе: Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэм'ер-міністр Эстоніі Калас лічыць, што краіне не патрэбны ўкраінцы, якія не размаўляюць па-эстонску

**Кіраўнік урада Эстоніі Кая Калас адзначыла, што ў краіне не жадаюць з'яўлення новай абшчыны, якая не размаўляе па-эстонску, паведамляе ERR.**

Паводле яе слоў, у Эстоніі знайшлі прытулак больш за 40 000 чалавек, пры гэтым каля 80 працэнтаў бежанцаў заявілі аб жаданні вярнуцца на радзіму.

«Мы не хочам, каб у Эстоніі з'явілася новая абшчына, якая не размаўляе па-эстонску. Нават калі яны вернуцца, а 80 працэнтаў бежанцаў кажуць, што хочуць вярнуцца, і калі яны вернуцца, то чаму б ва Украіне не быць групе людзей, якія ўмеюць размаўляць па-эстонску? У гэтым няма нічога дрэннага», — лічыць яна.

### Меркель заявіла, што пытанне яе ўдзелу ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне не стаіць

**Экс-канцлер Германіі Ангела Меркель заявіла, што пытанне адносна яе ўдзелу ва ўрэгуляванні расійска-ўкраінскага канфлікту не стаіць, паведамляе ТАСС са спасылкай на выданне Corriere della Sera.**

Меркель выказала ўпэўненасць, што канфлікт завершыцца перагаворамі, але адзначыла, што не ведае, калі менавіта гэта адбудзецца. Нямецкі палітык заявіла, што выступае за адкрытыя і сяброўскія перамовы, а не за навязаны мір.

### Сёлета ў ЗША ў інцыдэнтах са стральбой загінулі звыш 43,6 тысячы чалавек



**У Злучаных Штатах сёлета адбыліся тысячы інцыдэнтаў са стральбой, ахвярамі якіх сталі больш за 43,6 тысячы чалавек, у тым ліку 1,6 тысячы дзяцей. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на даследчую арганізацыю Gun Violence Archive.**

Адзначаецца, што на працягу адыходзячага года ў розных інцыдэнтах з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі былі паранены больш за 37,9 тысячы чалавек. Сярод іх 4,4 тысячы дзяцей.

Між тым, паводле статыстыкі, у папярэднія два гады ў выніку стральбы ў ЗША загінула яшчэ больш людзей. Напрыклад, летась было забіта 45 тысяч чалавек.

Па сутнасці

# Спадчына Саюза



Эпоха змяняе эпоху, дзяржава — дзяржаву. Такое яно, геапалітычнае быццё. Першая сусветная сцерла з карты свету чатыры імперыі і правілы прыстойнасці. А ідэі аб сусветнай рэвалюцыі паступова пачалі сціхаць у гарачых галовах новага свету — захапіць бы старыя тэрыторыі. Але мазолістая рука земляроба і рабочага сціснулася ў дужы кулак. Кулак, які гучна ўдарыў па сталі, дзе ляжала карта адной шостай часткі сушы. Яе, нібы драпежнікі здабычу, рэзалі інтэрвенты, капіталісты, мецэнаты, сэры і пэры. І пакуль стараражымная Расія спаборнічала ў рэгаліях у карчмах эміграцыі, новая савецкая ўлада мацнела. Тэрыторыі, ахопленыя агнём грамадзянскіх супярэчнасцяў, нацыянальны эгаізм, міжусобныя спрэчкі ў адзіны маналіт зліпі менавіта бальшавікі. Федэрацыя, канфедэрацыя. Не. Выжыць мог толькі сапраўдны саюз. Савецкі Саюз.

І ён мацнеў. Гэта быў час катастрафічных страт, гэта быў час вялізных магчымасцяў. На сусветным небасхіле дзяржаў узышла новая зорка — крамлёўская. Аказалася — самая яркая. Менавіта ленінскі праект — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік Еўропы і Азіі — першапачаткова быў задуманы як саюз раўнапраўных рэспублік. І РСФСР, і маленькая Беларусь уваходзяць у склад Савецкага Саюза на роўных. Замест дзяржавы-лімітрофа для Беларусі савецкая варыяцыя дзяржаўнасці аказалася па форме працэсійшай і больш зразумелай. Інакш той Беларусі, у якой мы жывём, не было б.

Спачатку трэба было Чалавека адваяваць у цемры страхаў згорбленых, як і самі сяляне, іх хат. Падняць вочы завадчаніна ад станка да святла. Лямпачка Ільіча заззяла ў хатах-чытальнях, а пад пампезнымі люстрамі сталічных музеяў, гарадскіх бібліятэк і ў светлых карпусах універсітэтаў зацюканы і сярмяжны люд перараджаўся ў новага — савецкага — чалавека.

Час Савецкага Саюза для Беларусі — гэта індустрыялізацыя, урбанізацыя і фарміраванне нацыянальнай беларускай культуры. Грандыёзныя будоўлі, новыя карпусы ўніверсітэтаў, светлыя і прасторныя пакоі кансерваторый і музеяў. Ці не гэты перыяд фарміруе шматнацыянальную цярпімасць у беларусаў? Бо менавіта пакаленне, апаленае Хатынню і Сталінградам, не будзе высвятляць, «чыёй ты крыві». Бо вельмі шмат яе пралілі тыя, хто Беларусь вызваляў.

У Беларусі фарміруецца свая эліта. З партызанскіх зямлянак на верх партыйнай наменклатуры ўзнімаюцца дзеці нацыі-пераможцы. На новыя скрыжаванні з хат з саламянымі стрэхамі выходзяць таленавітыя самародкі, яны дабіраюцца да самых высокіх трыбун ААН і вяршыняў космасу. Па партыйных прыступках яны крочаць упэўнена. Стомленыя — з працы, з радасцю — на працу. Потым крытыкі ўсяго савецкага бяздушна абзавуць гэтую партыйную плеяду камсамольскіх важакоў наменклатуршчыкамі. А яны верылі ў будучыню, стваралі праекты, будавалі заводы, масты і «спальныя» раёны. Яны сумленна спрачаліся на нарадах, закладвалі капсулы з пасланнямі і памыляліся.

Але як толькі здрадліва, паслужліва адвярнуліся ад створаных ідэй, каб дагадзіць імпартнаму джынсаваму дрэс-коду, гардэроб савецкай мадэлі стаў трашчаць па швах. Таму не варта дзівіцца цяперашнім з'явам на былой постсавецкай прасторы. Партыйныя бонзы падаліся на захад, героі і лаўрэаты — у нацыяналісты. Але ўнутраны свет, ідэйная свядомасць, культуралагічнае ўспрыманне і фундаментальныя веды засталіся нам у спадчыну. Яна, савецкая спадчына, у калектыўнай свядомасці беларусаў, у імёнах самых характэрных вулачак і сценах вялізных цэхаў, у рэцэптах прадуктовых брэндаў жыве. Да гэтага часу як сямейную рэліквію беларусы захоўваюць камсамольскія білеты, фарфоравыя статуэткі і добрую памяць аб Саюзе. Гэта не толькі палітычная ідэалогія. Гэта ідэалогія нашага мінулага. Жыццё некалькіх пакаленняў. Дзяржаўнасць. І шмат з таго, што ў нас ёсць, — ад маральных ідэалагем да прамысловых брэндаў — родам з СССР.

Будавалі ўсім светам, а развалілі адзінкі. Замест інтэрвентаў, капіталістаў, сэраў і пэраў. Разбурылі наменклатурныя драпежнікі трыма росчыркамі пяра дзяржаўны праект сямі дзесяцігоддзяў і намаганні сотняў мільёнаў людзей. Тады не было кулака, які б гучна ўдарыў па гэтым хмяльным стале Белавежжа. Кулак той з'явіўся крыху пазней.

Але насенне, пасеянае ў свядомасці пакалення, народжанага ў Савецкім Саюзе, прынесла свой плён. Каманда Прэзідэнта здолела захаваць лепшыя моманты грандыёзнага савецкага мінулага ўжо ў Незалежнай Беларусі. Таму сцяг Краіны Саветаў гарманічна выглядае ў сталічным ландшафце Музея гісторыі Вялікай Айчыннай. І як бы хтосьці ні апладзіраваў «лебядзінай песні Саюза», песні краіны шчаслівага дзяцінства па-ранейшаму адгукаюцца да мурашак у сэрцах нашага народа. Няўжо хтосьці ўтрымаецца, каб не заспяваць любімыя радкі: «Молодость моя, Белоруссия...».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# «ХІТЫ» ЭЛЕКТРОННЫХ ПАСЛУГ

## Удасканалены асабісты кабінет і 40 новых сэрвісаў за год

**Такімі дасягненнямі напрыканцы адыходзячага года можа пахваліцца Нацыянальны цэнтр электронных паслуг, для супрацоўнікаў якога 2022-і стаў вельмі прадукцыйным. Абноўленая версія асабістага кабінета, магчымасць праз інтэрнэт атрымаць звесткі пра аўто, даведацца аб памеры сацыяльных дапамог і падаткаў, прагледзець інфармацыю пра вакцынацыю, падаць мытную дэкларацыю... Гэта далёка не поўны пералік магчымасцяў, якія прапануе жыхарам краіны Адзіны партал электронных паслуг (АПЭП), а налета сэрвісаў стане яшчэ больш, абяцаюць спецыялісты лічбавай сферы. Сёлета, дарэчы, у Беларусі аказана больш за 72,6 мільёна электронных паслуг (летась іх было 17,5 мільёна). Пра найбольш запатрабаваныя існуючыя паслугі, а таксама крыху пра будучыя расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**



### СПРАВАВОДСТВА, ПОШТА І «АДНО АКНО»

Новая версія электроннага асабістага кабінета, які, як вядома, з'яўляецца ключом доступу да ўсіх электронных паслуг і сэрвісаў, змешчаных на партале, пабачыла свет яшчэ ў пачатку года. Выкарыстоўваць удасканалены рэсурс, які набыў больш магчымасцяў, цяпер можна не толькі для атрымання нейкіх паслуг, але і замаўляць у ім функцыі, якія раней былі неўласцівы. Цяпер тут можна, напрыклад, весці справаводства, расказала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг**:

— Раней прадпрыемству трэба было мець асобную сістэму дакументаабароту, каб карыстацца ёй для ўласных патрэб, а на партале — вырашаць іншыя задачы, атрымліваючы пэўныя паслугі. Цяпер жа, не выходзячы з асабістага кабінета юрыдычнай асобы, можна займацца ў ім справаводствам. Атрымліваць і накіроўваць карэспандэнцыю з адначасовым падключэннем да СМДА (сістэмы міжведамаснага дакументаабароту) у пакеце. Аднак такая магчымасць даступная толькі невялікім кампаніям.

У абноўленай версіі існуе таксама модуль «электронная пошта». Аднак гэта не паўнавартасная паштовая праграма для электроннага ліставання, а менавіта сэрвіс асабістага кабінета. З яго дапамогай могуць абменьвацца лістамі ўладальнікі актываваных асабістых кабінетаў. Пасродкам новага асабістага кабінета могуць абменьвацца паміж сабой дакументамі і EDI-правайдары (гэтая магчымасць яшчэ дапрацоўваецца).

Новая версія асабістага кабінета дазваляе таксама працаваць аператарам «аднаго акна» спецыялісту, які ў рабоце карыстаецца праграмным комплексам «Адно акно». Ён адрозніваецца ад службы «адно акно», куды грамадзяне звяртаюцца з заявамі на атрыманне пэўных адміністрацыйных працэдур, удакладніла спецыяліст:

— У праграмным комплексе «Адно акно», акрамя аператараў аднайменных службаў, могуць працаваць і прадстаўнікі іншых арганізацый, якія таксама ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры. Адміністрацыйныя і электронныя паслугі, а таксама механізм іх рэалізацыі на адзіным партале ў нечым падобныя, аднак маюць адрозненні. Пералік адміністрацыйных працэдур рэгламентаваны заканадаўча: для фізічных асоб — Указам Прэзідэнта № 200, для юрыдычных — пастановай Саўміна № 548. Усе дзеянні, прапісаныя ў згаданых дакументах, лічацца адмінпрацэдурамі. Усё, чаго ў іх няма, — электроннымі паслугамі.

Зараз адбываецца пераход на праграмны комплекс «Адно акно» версіі 3.0, які запрацуе ў 2023 годзе і ўяўляе сабой менавіта пашыраны функцыянал асабістага кабінета. Іншымі словамі, уладальнік асабістага кабінета як аператар «Аднаго акна» мае крыху больш пераваг у параўнанні з тым, калі б ён працаваў у сваім кабінеце проста як юрыдычная асоба. У якасці аператара можна таксама ствараць заявы і апрацоўваць іх.

### СТРОГІ ЎВАХОД — МАКСІМУМ ПАСЛУГ

Цяпер асабістыя электронныя кабінеты аўтаматычна створаны для ўсіх беларусаў (на падставе звестак з рэгістра насельніцтва) і патрабуюць толькі першаснай актывацыі.

Каб «адчыніць» асабісты кабінет найбольш дакладна і мець доступ да максімальнай колькасці паслуг, актываваць яго лепш праз строгую аўтэнтыфікацыю, параіла Святлана Караневіч:

— Гэта патрэбна, каб сістэма дакладна ідэнтыфікавала чалавека, звязаўшы даныя з рэгістра насельніцтва з дакладнай асобай. Даныя з рэгістра ў сваю чаргу становяцца даступнымі толькі пры ўводзе грамадзянінам свайго ідэнтыфікацыйнага нумару падчас строгай аўтэнтыфікацыі з дапамогай ID-карткі ці электроннага лічбавага подпісу. Пры нястрогай аўтэнтыфікацыі кабінет намінальна таксама будзе адкрыты, аднак, паколькі сістэма не ідэнтыфікуе вас на 100 %, то і даступных вам паслуг будзе значна менш.

Паслуг, якія даступны толькі пры строгай аўтэнтыфікацыі з дапамогай ID-картак, усё больш. Гэта тлумачыцца ў тым ліку і захвочваннем беларусаў заказваць новыя дакументы. На сёння актывавана каля 200 тысяч асабістых кабінетаў: каля 110 тысяч — фізічнымі асобамі і 90 тысяч — юрыдычнымі.

— У новай версіі кабінета яго ўладальнік можа самастойна падпісвацца на паслугі, а таксама праглядаць стан асабістага рахунку, які цяпер аўтаматычна ствараецца да кожнага кабінета, адкрытага па строгай аўтэнтыфікацыі, — падкрэсліла Святлана Караневіч. — Раней трэба было штораз аплачваць паслугу, каб яе атрымаць, а цяпер можна проста папоўніць сродкі на рахунку — з яго будуць аўтаматычна спісвацца грошы за заказаныя паслугі. А на спецыяльнай укладцы можна праглядаць, за што і колькі вы плацілі.

### ПРА ДАПАМОГІ, ПРАВАПАРУШЭННІ, АЎТАМАБІЛІ...

За год цэнтр стварыў для карыстальнікаў 37 новых паслуг і чатыры адміністрацыйныя працэдуры. Гэткі высокі паказчык — сведчанне зацікаўленасці органаў у асваенні лічбавай прасторы, упэўнена начальнік аддзела:

— Аптымізацыя лічбавага ўзаемадзеяння паміж сабой дзяржорганаў таксама ў выніку садзейнічае якасці атрымання паслуг грамадзянамі. Калі юрыдычныя асобы проста ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, гэта аўтаматызуе працэсы, адпаведна, хутчэй прымаюцца рашэнні адносна грамадзян па іх заявах.

Адна з апошніх прапаноў цэнтра — паслуга 3.16.04 «Інфармацыя аб памеры атрымання (неатрымання) дапамогі па доглядзе інваліда 1 групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту», што аказваецца на падставе звестак дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу «Банк даных сацыяльных выплат» Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Дзякуючы ёй грамадзянін можа праз партал атрымаць звесткі, ці з'яўляецца ён асобай, якая даглядае інваліда ці састарэлага, каб атрымаць нейкія льготы, абазначыла начальнік аддзела:

— Папулярнай сярод беларусаў стала і паслуга 3.19.02 «Прадастаўленне фізічным асобам звестак аб правапарушэннях, якія захоўваюцца ў адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях». Такога кшталту інфармацыя можа спатрэбіцца, напрыклад, пры працаўладкаванні, у дачыненні да самога сябе ці трэцяй асобы (па даверанасці). З ліпеня такіх паслуг аказана ўжо 10 тысяч.

Яшчэ адной яскравай і запатрабаванай беларусамі стала паслуга 3.58.01 «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто», дзякуючы якой можна даведацца пра марку, нумар, наяўнасць страхоўкі і тэхагляду аўто, а таксама праверыць, ці не знаходзіцца машына ў вышуку, удакладніла спецыяліст цэнтра:

— У гэтую комплексную паслугу інтэгравана некалькі рэсурсаў: Дзяржаўтаінспекцыі, Белтэхагляду, Бюро па транспартным страхаванні. Паслуга даступная ўсім карыстальнікам. Акрамя комплекснай паслугі, існуюць асобныя паслугі на падставе звестак з рэсурсаў Дзяржаўтаінспекцыі, даступныя толькі пэўнай катэгорыі спажыўцоў (дзяржорганаў). Звесткі пра знаходжанне аўто ў вышуку (па рэгістрацыйным знаку) выкарыстоўваюцца, дарэчы, не толькі з беларускіх баз даных, але і з рэсурсаў краін СНД.

### ДАДАТКОВАЯ ПЕНСІЯ І ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЯ АДНАГО ДНЯ

З 1 студзеня 2023 года беларусы змогуць добраахвотна плаціць новы падатак на прафесійны даход (ППД). Каб падаваць звесткі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН), на адзіным партале ўжо запрацавала электронная паслуга 3.21.04 «Атрыманне звестак аб плацельшчыках падатку на прафесійны даход, пры адміністраванні ППД, у частцы страхавых узносаў плацельшчыкаў ППД», якая аўтаматызуе ўзаемадзеянне Міністэрства па падатках і зборах і ФСАН.

З 1 лістапада пашырыўся функцыянал электроннай паслугі 3.64.01 «Добраахвотнае накапляльнае пенсіённае страхаванне», якая дае чалавеку магчымасць з дапамогай страхавога прадпрыемства накопліваць дадатковыя грошы на старасць. Цяпер у асабістым кабінеце на партале працадаўца (ён мусіць удзельнічаць у праграме, калі жаданне ўзяць удзел аформіў яго падначалены) можа ствараць спісы розных тыпаў, а таксама прагледжваць іх і пры неабходнасці рэдагаваць змест спісаў, папярэдне накіраваных у страхавое прадпрыемства «Стравіта».

На партале даступна таксама паслуга 3.65.02 «Прадастаўленне звестак для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў (ад медыцынскіх работнікаў)». З новага года запрацуе і паслуга 3.65.01 «Прадастаўленне звестак для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў (ад грамадзян)».

— Сэрвісы створаны для выяўлення рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў сістэмы кровазвароту, анкалагічных хвароб, хранічных абструкцыйных захворванняў лёгкіх і цукровага дыябету, — абазначыла Святлана Караневіч. — Яны рэалізаваны ў выглядзе анкетавання. У залежнасці ад адказаў чалавека сістэма сфармулюе дакумент, дзе будзе ўказана, да якіх захворванняў патэнцыйна можа быць схільны чалавек. Гэта зроблена, каб рэалізаваць ідэю дыспансерызацыі аднаго дня: запоўніў анкету — наведаў урача — атрымаў дапамогу.

**Ірына СІДАРОК.**

---

У наступным годзе цэнтр працягне работу па інтэграцыі новых дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў (ДзІР) з агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмай (ААІС), дзе будуць утрымлівацца новыя цікавыя звесткі, на падставе якіх будуць канпанавацца новыя паслугі для фізічных і юрыдычных асоб, запэўніў **дырэктар НЦЭП Раман ГРАДУСАЎ**:

— З ААІС пакуль інтэграваны 47 інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйных сістэм. І яны ўжо даюць ашаламляльны вынік па пошуку патрэбнай інфармацыі. Уяўляеце, што будзе, калі іх стане больш! Мы вядзём актыўныя перамовы з дзяржаўнымі органамі — уладальнікамі новых рэсурсаў, каб на партале з'явілася ўсё больш цікавых паслуг. Відавочна, што больш зручнымі для карыстальнікаў становяцца зносіны з дзяржорганамі праз мабільны тэлефон, таму налета ў нас з'явіцца мабільная версія партала. Ужо амаль завершана работа над праграмай, якая дазволіць счытваць даныя з ID-картак з дапамогай мабільнай прылады і такім чынам аўтарызавацца на АПЭП, і чалавеку не патрэбны будзе счытвальнік карткі для аўтарызацыі праз камп'ютар. Такім чынам удасканаліцца электроннае ўзаемадзеянне чалавека з дзяржавай.

Раман Градусаў павіншаваў беларусаў з надыходзячым Новым годам, пажадаўшы ісці ў нагу з часам і актыўна асвойваць перавагі лічбавага свету, які з кожным днём становіцца ўсё больш відавочнай рэальнасцю. Варта актывіраваць уласныя электронныя кабінеты, каб карыстацца зручнымі сэрвісамі, тым больш што сістэма аховы інфармацыі таксама актыўна развіваецца, і ў ААІС рэалізаваны ўсе тэхналогіі, якія не дазволяць персанальным даным чалавека згубіцца, падкрэсліў ён.


ПАСЛУГІ ДЛЯ ГРАМАДЗЯН І БІЗНЕСУ

НЦЭУ

Сёлета на адзіным партале электронных паслуг з'явілася каля 40 новых сэрвісаў, якія аўтаматызуюць зносіны грамадзян і бізнесу з дзяржавай

**Новыя магчымасці асабістага электроннага кабінета:**

- справаводства;
- пошта;
- работа аператараў «аднаго акна».



**З дапамогай новых паслуг можна:**

- прайсці дыспансерызацыю аднаго дня;
- атрымаць звесткі пра аўтамабіль;
- аформіць падатак на прафдзейнасць;
- даведацца пра памер дапамог.

Падрабязней — на адзіным партале электронных паслуг
https://platform.gov.by

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. УНП 191700161

# З АДКРЫТЫМ СЭРЦАМ

## Чаму іншаземцы імкнуцца трапіць у Беларусь?

**У Беларусь з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму для жыхароў суседніх краін Еўрасаюза прыехала каля 380 тысяч іншаземцаў. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце. Сёлета па бязвізе ў Беларусь прыбылі 244 тысячы грамадзян Літвы, больш чым 113 тысяч жыхароў Латвіі, а таксама больш чым 20 тысяч грамадзян Польшчы. За мінулы тыдзень нашу краіну наведала звыш васьмі тысяч іншаземцаў, большасць з якіх — грамадзяне Літвы. Відавочна, што колькасць жыхароў суседніх краін, якія імкнуцца трапіць у Беларусь, нягледзячы на супрацьдзеянне ўлад сваіх дзяржаў, стабільна павялічваецца. Чаму так адбываецца?**

### ВЫРВАЦЦА З «ЗАЛЮСТРОЎЯ»

Адна з апошніх добрых навін для жыхароў суседніх краін — Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову Савета Міністраў і Міністэрства замежных спраў аб прадаўжэнні на 2023 год бязвізавага рэжыму ўезду, які дзейнічае з Літвой, Латвіяй і Польшчай. Як адзначылі ў прэс-службе беларускага лідара, такое рашэнне прынята ў пацвярджэнне адкрытасці нашай краіны, накіраванасці на добрасуседства і ўмацаванне міжнацыянальных сувязяў. Грамадзяне Літвы, Латвіі і Польшчы і надалей змогуць без перашкод наведваць Рэспубліку Беларусь, сустракацца са сваякамі, наведваць месцы пахавання, атрымліваць медыцынскія і іншыя паслугі.

Начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Андрэй Кажан у гутарцы з журналістамі растлумачыў прычыны ініцыятывы МЗС па прадаўжэнні на 2023 год бязвізавага рэжыму для жыхароў Літвы, Латвіі і Польшчы, паведаміла БелТА. Ён нагадаў, што бязвізавы ўезд у Беларусь быў уведзены для грамадзян Літвы, а таксама грамадзян і неграмадзян Латвіі з 15 красавіка гэтага года, а з 1 ліпеня гэтую магчымасць атрымалі таксама і грамадзяне Польшчы.




Па цяперашніх часах гэта суперільготны рэжым, адзначыў Baltnews. Уехаць наземным транспартам было амаль немагчыма з-за строгіх каранцінных забарон. Без візы пускалі ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, але прамых рэйсаў з ЕС туды няма. Таму грамадзяне еўрапейскіх дзяржаў лёталі ў Беларусь праз Стамбул ці іншыя далёкія хабы. Гэта дорага і доўга, і большасці жыхароў суседніх краін такое не па кішэні. Для іх бязвіз — насамрэч цудоўная магчымасць вырвацца з «залюстроўя», заўважыў Baltnews.

### НА СВАЕ ВОЧЫ

Нядзіўна, што 380 тысяч іншаземцаў з вялікім задавальненнем скарысталіся бязвізам і наведалі Беларусь. «Пагадзіцеся, гэта лічба вельмі і вельмі немалая. Прычым паездкі здзяйсняюцца з рознымі мэтамі: проста ў госці да сваякоў, знаёмых, сяброў, каб наведаць месцы пахавання, для бізнес-кантактаў, турызму, атрымання медыцынскіх паслуг, — заўважыў Андрэй Кажан. — З пачатку ўвядзення бязвізавага парадку мы рэгулярна, ледзь не кожны дзень, атрымліваем словы падзякі як пісьмова, так і вусна за гэтае пачынанне. І ў тым ліку мы атрымлівалі звароты нашых дыяспаральных аб'яднанняў — ці будзе прадоўжаны гэты парадак надалей, на наступны год? Улічваючы ўвесь пазітыў, які мы маем з увядзеннем бязвізавага парадку, і звароты беларусаў, дыяспар, МЗС выступіла з ініцыятывай гэты парадак прадоўжыць. Прыемна, што наша ініцыятыва была падтрымана кіраўніком дзяржавы, і, такім чынам, бязвізавы парадак уезду будзе захаваны для грамадзян Літвы, Польшчы і грамадзян/неграмадзян Латвіі на 2023 год», — адзначыў начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС.

Ён звярнуў увагу, што гэта ініцыятыва «здзяйсняецца насуперак і нягледзячы на ўсе тыя абмежаванні, якія, на жаль, існуюць у адносінах да беларускіх грамадзян, у тым ліку пры афармленні віз. Больш за тое, у сумежных краінах распаўсюджваюць страшылкі пра Беларусь, перасцерагаючы ад паездак». У сувязі з гэтым Андрэй Кажан прапанаваў усім ахвотным прыехаць у нашу краіну і асабіста пераканацца ў беспадстаўнасці і абсурднасці такіх перасцярог і запалохванняў. Ён расказаў, як аднойчы яму самому давялося развейваць страхі і апасенні замежнага госця: чакаў у госці знаёмага з суседняй краіны, а той за дзень да візіту засумняваўся, ці варта ехаць: «Дык жа ў вас, у Беларусі, не запраўляюць машыны з нашымі нумарамі». «Я тут жа пад'ехаў на найбліжэйшую заправачную станцыю з гэтым пытаннем, мне адказалі: «Колькі тон трэба вашаму знаёмаму?» — распавёў амаль анекдатычную гісторыю прадстаўнік МЗС.

«Не трэба апасацца, не варта слухаць страшылкі пра магчымасць прыезду да нас. Лепш за ўсё паглядзець усё самому і пераканацца на свае вочы. Тое, што бязвізавы парадак уезду працягваецца на чарговы, 2023 год, якраз з'яўляецца пацвярджэннем таго, што Беларусь — краіна гасцінная, беларусы — гасцінныя людзі, — падкрэсліў начальнік галоўнага консульскага ўпраўлення МЗС. — Я спадзяюся, што цяпер пытанне для многіх літоўцаў, латышоў і палякаў, дзе сустрэць новы, 2023 год, вырашана».

### ЧЫСЦІНЯ І СПАКОЙ

| Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Газопровод, электроснабжение, связь | 321084004101001201, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома, площадь – 0,1100 га, адрес: Гомельский район, аг. Красное, ***ул. Ленина В.И., участок № 4*** | Частная собственность | 13167,00 бел. руб. | Затраты по созданию земельного участка (без опубликования настоящего объявления) 1649,50 бел. руб. | 1316,70 бел. руб. | Красненский сельский исполнительный комитет, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12 А, тел. 8 0232-92-35-77, тел. 8 0232-92-35-78 |
| Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Газопровод, электроснабжение, связь | 321084004101001234, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома, площадь – 0,1018 га, адрес: Гомельский район, аг. Красное, ***ул. Ленина В.И., участок № 15*** | Частная собственность | 12185,46 бел. руб. | Затраты по созданию земельного участка (без опубликования настоящего объявления) 1767,13 бел. руб | 1218,55 бел. руб. | Красненский сельский исполнительный комитет, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12 А, тел. 8 0232-92-35-77, тел. 8 0232-92-35-78 |

1. **Аукцион состоится 18 января 2023 года в 14.00 в административном здании Гомельского районного исполнительного комитета по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51 а, малый зал (3-й эт.)**

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при двух и более участниках, претендующих на участок.

Участнику необходимо подать заявление в Красненский сельский исполнительный комитет с указанием кадастрового номера земельного участка, который он желает приобрести в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Лица, желающие принять участие в аукционе к заявлению прилагают: квитанцию об оплате задатка (реквизиты платежа уточняются в бухгалтерии Красненского сельисполкома), а также предоставляют копию документа, содержащего их индикационные сведения, без нотариального засвидетельствования. Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность. При подаче документов на участие в аукционе представители гражданина предоставляют паспорт или иной документ удостоверяющий личность

3. Заявление по участию в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 15.00 по адресу: Гомельская область, Гомельский район, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12а, кабинет, № 4, **последний день приема документов – 17.01.2023 года до 13.00.**

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. При этом ему в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан подписать протокол аукциона, не позднее 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, затраты на подготовку и проведение аукциона и опубликования настоящего извещения.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении повторных электронных торгов № **2023.Ч.002.00007** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** производственное унитарное предприятие «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», г. Минск, пр-т Партизанский, 168, тел. +375 (017) 379-31-32.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 16.01.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 500/С-45475 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/2, площадью 2501,7 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад сырья. Кап. строение с инв. № 500/С-42205 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/18, площадью 328 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: мехмастерские. Кап. строение с инв. № 500/С-42222 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/15, площадью 489,0 кв. м, назначение: здание специализированное для общественного питания, наименование: столовая. Кап. строение с инв. № 500/С-45466 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/17, площадью 125,3 кв. м, назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: столярная мастерская. Кап. строение с инв. № 500/С-45467 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/8, площадью 565,8 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад сборный. Кап. строение с инв. № 500/С-42218 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/3, площадью 1360 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-42204 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168, площадью 240 кв. м, назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус; составные части и принадлежности проезд 4 шт., площадка 21 шт., дорожка 3 шт., лестница, ограждение 2 шт., бортовой камень, ворота 11 шт., калитка 3 шт., ограждение мет. Кап. строение с инв. № 500/С-42206 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/1, площадью 29 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: проходная с весовой. Кап. строение с инв. № 500/С-45465 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/20, площадью 69,3 кв. м, назначение: здание специализированное энергетики; наименование: здание специализированное энергетики (подстанция). Кап. строение с инв. № 500/С-45470 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/4, площадью 6,7 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: водонапорная башня. Кап. строение с инв. № 500/С-45464 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/19, площадью 18,8 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание специализированное иного назначения (АТС). Кап. строение с инв. № 500/С-42217 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/5, площадью 1322 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-45468 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/10, площадью 548,7 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад МТС. Кап. строение с инв. № 500/С-42219 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/11, площадью 1552 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: фруктохранилище. Кап. строение с инв. № 500/С-42221 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/13, площадью 1799,0 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: консервный цех. Кап. строение с инв. № 500/С-42220 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/12, площадью 2426 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: соковый цех (Р1/к). Кап. строение с инв. № 500/С-42215 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/7, площадью 710 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. Кап. строение с инв. № 500/С-42216 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/6, площадью 1011 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Сооружение с инв. № 500/С-1013150 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168, протяженностью 2689,4 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадная хоз.-питьевая водопроводная сеть, составные части и принадлежности: Лит. А – внутриплощадная хоз.-питьевая водопроводная сеть, лит. Б – колодец, камера, лит. В – артезианская скважина № 1, лит. Г – артезианская скважина 1а, лит. Д – артезианская скважина № 2, лит. Е – артезианская скважина № 3. Сооружение с инв. № 500/С-1013155 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168, протяженностью 3231,05 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная хоз.-фекальная канализационная сеть, составные части и принадлежности: Лит. А – трубопровод хоз.-фекальной канализационной сети, лит. Б – выпуски, лит. В – колодец, камера, лит. Г – отстойники. Сооружение с инв. № 500/С-1013154 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168, протяженностью 1768,78 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадная ливневая канализационная сеть, составные части и принадлежности: Лит. А – трубопровод ливневной канализационной сети, лит. Б – выпуски, лит. В – колодец, камера, лит. Г – дождеприемник. Устройство низковольтное комплектное автом. систем управления электроприводами НКУ АСУЭ-НН/2-026-4-2-2-2-1IP65-УХЛ4, инв. № 1628. Счетчик импульсов «Вега» NB-11, подключенный к системе диспетчеризации инв. № 1663. Счетчик холодной воды СТВХ-80, инв. № 1619. Кап. строения расположены на зем. участке с кадастровым № 500000000002005960 (право общего долевого постоянного пользования).

**Обременения по объектам недвижимого имущества:** договоры аренды, с условиями которых можно ознакомиться по предварительному согласованию с Продавцом, залог, ипотека ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» (договор об ипотеке от 27.05.2020 № 5000390520-7; договор об ипотеке от 28.06.2022 № 5000200622-7). Запрет на отчуждение будет снят после оплаты Покупателем приобретенного предмета электронных торгов.

**Обременения по земельному участку** с кадастровым № 500000000002005960: сервитут (договор об установлении сервитута от 10.06.2011 № б/н), границы которого определены в земельно-кадастровом плане земельного участка.

**Нач. цена**: 8 488 280,88 бел. руб. с учетом НДС.

**Задаток**: 848 828,08 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в** электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах в порядке, размещенном на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 13.01.2023.**

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторных электронных торгов**: Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов; оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 15 (пятнадцати) раб. дней со дня проведения эл.торгов; оплатить предмет эл. торгов: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, оплата предмета аукциона должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

*Расходы продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов составляют 9487,90 бел. руб. с НДС.* Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 31.08.2022, 11.10.2022, 12.11.2022. С подробной информацией о предмете эл. торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе: «недвижимость». Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (25) 500 29 21 – Протченко Татьяна Михайловна.

Перадсвяточнае

# БЛІСКУЧАЯ КАРАЛЕВА ЗАЧАРОЎВАЕ ВЕЧНАСЦЮ

## Прэм'ера каляднай оперы «Гісторыя Кая і Герды» адбылася ў Вялікім тэатры

**У халадэчы і снягоў няма шанцаў, нават калі яны здаюцца татальнымі. Ці калі імкнуцца пераканаць у сваім вечным існаванні. Так, сняжынкі-слязінкі і льдзінкі-іскрынкі могуць атруціць холадам адно сэрца, але яно абавязкова аджыве, калі за яго перажывае другое, гарачае. Андэрсан прыдумаў цудоўную казку на ўсе часы — пра Снежную Каралеву. Але асабліва моцныя яе чары якраз цяпер, калі людзі святкуюць Каляды. У гэтыя дні зварот у цудоўныя часы, калі мы ўсе верылі ў казкі, магчымы ў Вялікім тэатры оперы і балета, дзе паказалі «Гісторыю Кая і Герды» ў пастаноўцы Ганны Маторнай.**



Гэта абсалютна паўнавартасны оперны спектакль на два аддзяленні. Нават цяжка назваць яго пастаноўкай для дзяцей, для якіх, як правіла, ствараюцца казкі. Усё шыкоўна, бліскуча. Па-даросламу. Пачынаючы ад музыкі кампазітара Сяргея Баневіча і зорных выканаўцаў, што служаць у нашым тэатры, да шыкоўнага мастацкага афармлення з візуальнымі спецэфектамі. На сцэне вырастае сапраўды сярэднявечны горад, у якім віруе жыццё ў святочнай атмасферы, дзе ў жыхароў поўна клопатаў — хто гандлюе, хто чысціць трубы, а хто запальвае ліхтары. У розных сцэнах мы нібыта бачым розныя вулкі з іншымі дамамі. Нават можам зазірнуць у адзін, дзе жывуць дзяўчынка Герда (яе партыю спявала Настасся Міхнавец) і хлопчык Кай (Віктар Мендзялеў), якога прытуліла яе сям'я, але раптам адчуваем холад у яго голасе. Сцэны мяняюцца хутка і незаўважна: то мы сярод бялюткіх снягоў, якія закрываюць усе шляхі да жытла Каралевы, то на дарозе бачым зладзеяў з Атаманшай (імпэтную матухну ўвасабляе барытон Станіслаў Трыфанаў), то спыняемся разам з Гердай у чароўным лесе, які квітнее ад таго, што сюды завітала дзяўчынка з сэрцам, поўным любові, — яна шчодра дзеліцца ёю з іншымі. І нават ільды ў царстве Каралевы адступаюць... Мастакі Вольга Мельнік-Малахава і Андрэй Меранкоў прыдумалі ўдалую сцэнаграфію, якую падмацоўваюць касцюмы Таццяны Лісавенкі, што зрабіла іх умоўна-гістарычнымі, але пры гэтым казачна шыкоўнымі. З'яўляецца бліскучая Снежная Каралева (артыстка Аксана Волкава) — і няма пытанняў, чаму Кай за ёй пойдзе. Праўда, яна не пануе на сцэне суцэльна. Але вось гэтая бялюткая зіхатлівасць і празрыстасць яе ўладарства (пры гэтым не перагрувашчанага!) разам з прышпільнымі служкамі-тролямі спакушае стрыманай стылёвасцю. І, безумоўна, чаруюць яе спевы — магутныя і з металам у голасе. Сапраўды ж — каралева...

Наогул, спевы — асобная тэма, калі гаворка пра дзіцячую оперу. Якія прыгожыя партыі патрэбныя, каб малыя ў зале маглі выседзець амаль дзве гадзіны і сачыць за тым, што адбываецца на сцэне! Якія словы — і як! — трэба спяваць, каб дзеці разумелі, пра што размова. Усе стараюцца апяваць іх дакладна і пранікнёна. Нават дзіцячую лічылачку, устаўленую ў дуэт Кая і Герды, — яна адразу ўключае ўвагу малых. А якія акцёрскія здольнасці выяўляюць оперныя спевакі, якія, згодна з жанрам, маглі б абазначаць характар сваіх персанажаў выключна галасам. Але не, цяпер гэтага мала ў Оперным тэатры — ён (асабліва калі пастаноўка прадугледжвае публіку з дзецьмі) павінен быць жывым, а не статычным.





Фота Ірыны МАЛАХАВАЙ.

А вось гэта ўжо работа для чараўніка-рэжысёра. Ганна Маторная любіць рабіць спектаклі, напоўненыя людзьмі. У дадзеным выпадку гэта азначае напоўненасць жыццём, што і метафарычна, і сімвалічна: менавіта жывая любоў павінна перамагчы ўнутраны холад. А любоў — справа чалавечая. Людзі — дарослыя і маленькія — увасабляюць насельнікаў горада. Яны ўвесь час у руху. У спектаклі вельмі шмат музыкі, калі з'яўляюцца харэаграфічныя мініяцюры — асабліва кранае, калі на сцэне танцуюць дзеці, а малыя ў зале імкнуцца іх падтрымаць воплескамі. І як жа яны радуюцца, калі пазнаюць у балетным эпізодзе Стойкага алавянага салдаціка і крохкую маленькую танцоўшчыцу! Пляскаюць у ладкі гарэзлівым камінарам. Нават Высакароднаму Аленю, які хоць і казачны, але вельмі мілы і таксама спявае. Перажываюць за Кая, калі той імкнецца з кубікаў скласці правільное слова: Каралева чакае. Каб з літар утварылася «вечнасць», а пры з'яўленні Герды атрымліваецца «любоў» — і дзеці шапочуць. Але што дзеці. Тут і дарослы зразумее, што казка насамрэч — не заўсёды казка. Бо ўсё рэальна. Асабліва ўсёперамажная любоў. Не адразу, але пакрысе, дзень за днём мы пазнаём яе розныя праявы. Не ў адно імгненне, але з часам разумеем, як яна нас мяняе. У Герды сышло шмат часу на доўгае падарожжа, якое пачалося на Калядах, а скончылася ў веснавой квеценi. Глядач Вялікага тэатра можа за два акты оперы адчуць у сабе змены, вартыя цуду.

Вось казачнай здавалася мара паставіць оперу, якая яднала б гледачоў розных пакаленняў. Ёсць жа шмат дарослых, для якіх опера — не самы просты жанр. Менавіта таму і не хацелася называць гэты спектакль дзіцячым. Няхай ідуць глядзець «Гісторыю Кая і Герды» ўсе — столькі пра сябе можна зразумець падчас прагляду. Нават запісацца ў аматары оперы на ўсё астатняе жыццё. І быццам бы яшчэ адна льдзінка растае...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*У вершах і прозе Людміла Кебіч часта звяртаецца да тэмы жаночага лёсу. Жанчына ў яе творах — маці, паэтка, каханая — самаадданая і светлая душой. Жыццё часам выпрабоўвае яе на трываласць, але не згасае любоў у яе сэрцы — да родных людзей, да Беларусі.*

*На конкурс «Звязды» пісьменніца прапануе апавяданне ў форме прытчы. Гераіня твора любіць, непакоіцца, разважае... Мужчына застаецца «за кадрам», але адыгрывае ў жыцці жанчыны сваю ролю.*

**Алена БРАВА.**

**Людміла КЕБІЧ**

# ШНАРЫ

*Апавяданне*

Жылі-былі муж і жонка. На працу хадзілі, кахалі адно аднаго, увесь вольны час бавілі разам. І было ў іх усё добра. А потым нарадзіліся дзеці. Шчасця дадалося ўдвая для абаіх, а вольнага часу паменела, асабліва ў жонкі, бо яна, акрамя таго што жанчына, стала цяпер і маці. А ў маці, як вядома, занятыя штохвілінныя турботамі не толькі рукі, але і сэрца.

Маці гадавала дзяцей, клапацілася пра іх штодзённа і штоночна. Зразумела, бацька таксама браў у гэтым удзел, у асноўным матэрыяльны. А маці жыла жыццём сваіх дзяцей, перажывала разам з імі ўсё, што адбывалася ці магло адбыцца. А гэта значыць, яна пражывала адначасова два, а потым і тры жыцці — за сябе і за сваіх дзяцей.

Жыццё наша доўгае і не толькі песціць нас радасцямі. Перажыванні драпалі сэрца маці і заставаліся на ім балючымі адмецінамі-ранкамі — шнарамі. Шнары — гэта сур'ёзна... І небяспечна. Шнары — гэта непрыгожа. І калі мужчыны лічаць, што шнары ўпрыгожваюць іх твар, дык зусім іншае яны думаюць на гэты конт пра жанчын, таму што адна справа, калі шнары на душы, і зусім іншая — на...

Пачала заўважаць жанчына-маці, мімаходзь зазіраючы ў люстэрка, што з'віліся на яе твары незнаёмыя рысы, рыскі і рысачкі. «Што гэта са мною?» — дзівілася моўчкі. «Гэта шнары, твае, уласныя, — паведаміў ёй прыгожы белы Анёл, які прысеў на плячо. — У тваім сэрцы для іх ужо не хапае месца, таму шнары пачалі выпаўзаць на твой твар. Пад іншым імем, зразумела, цяпер яны — зморшчыны».

Трывожна і пакрыўджана зашчымела сэрца, але жанчына загадала яму: «Хопіць, з хваляваннямі скончана раз і назаўсёды. Я не хачуператварыцца ў суцэльны шнар!» Жанчына жадала гэтага і думала, што здолее выканаць свой загад. Не змагла. А як? Яна ж — жанчына, маці і ўжо нават бабуля! Хто ж тады будзе хвалявацца і перажываць за мужа, за дзяцей, унукаў?.. За лёсы родных і блізкіх?.. За Айчыну, урэшце!..

А шнары толькі таго і чакалі, і кожны дзень хоць адна сумная рысачка ды прымошчвалася на ўсё яшчэ (а дакладней, заўсёды) прыгожым і светлым твары жанчыны.

Надышоў час, калі жанчына зглавіла сябе на думцы, што не хвалюецца болей, і ў жыцці яе наступіў доўгачаканы спакой. Узрушаная, яна падышла да люстэрка, каб зірнуць на свой твар: «Можа, і зморшчын паменела?» Адтуль пасміхалася яшчэ не старая, ды нейкая незнаёмая жанчына, твар якой уяўляў суцэльную сетку.

— Божа, навошта?! — усклікнула яна з жахам і адхіснулася ад люстэрка.

— А гэта ўсе твае шнары цалкам высыпалі на твар для таго, каб іх бачылі тыя, хто ў іх з'яўленні вінаваты. Пакуль ты і яны яшчэ жывыя, — патлумачыў усё той жа крылаты белы Анёл, што незаўважна прысеў, як і некалі раней, на плячо сваёй падапечнай.

— А што сталася з мужчынам? — спытаецеся вы.

Ах, мае любыя! Няўжо не здагадаліся?.. Хіба не заўважылі яго, той ШНАР — самы выразны, глыбокі і балючы на твары жанчыны?..

# ЧАКАЕМ У ГОСЦІ ЧОРНАГА ТРУСА

## Што год наступны нам рыхтуе?

**Надыходзячы 2023 год па ўсходнім календары — год Чорнага (Вадзянога) Труса. І гэта выдатна, таму што Трус — самы прыязны і міралюбівы «звер» усходняга гараскопа. Год абяцае завяршэнне любых канфліктаў — як у грамадстве, так і ў сям'і, а таксама сямейнае шчасце, рамантыку, нараджэнне дзяцей і матэрыяльны дабрабыт.**



Трусік вызначаецца добрым густам і не любіць стракатасці.

Нечаканасцяў і сюрпрызаў лёсу заступнік надыходзячага года не любіць, а стыхія вады дадае яму спакою і разважлівасці. Астролагі кажуць, што практычна любы год Вадзянога Труса (дарэчы, год менавіта Чорнага Вадзянога Труса па ўсходнім гараскопе прыходзіць раз у 60 гадоў) можна аднесці да спакойных і мірных. Трэба дадаць, што больш за ўсё са знакаў задыяка, калі верыць астролагам, заступнік надыходзячага года спрыяе тым, хто належыць да стыхіі вады: Рыбам і Ракам, а таксама «зямным» Дзевам і Цяльцам. Зрэшты, добрым Трусік будзе да ўсіх. Гэты мілы пухнацік валодае мяккім нязлосным норавам, і хоць бывае хітрым, сюрпрызы падае ў асноўным добрыя. Так што, уступаючы ў год Труса, можна спадзявацца: тое, што ў нашым жыцці перавярнулася з ног на галаву, пакуль у нябёсах панаваў суровы і непрадказальны Тыгр, вернецца ў звыклае рэчышча — і мы з радасцю ўсвядомім, што так сапраўды лепш!



Ва ўборы ёлкі сёлета — не больш за 3-4 асноўныя колеры!

### СЯМЕЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Усходні гараскоп — ён яшчэ называецца кітайскі па краіне паходжання — налічвае тысячы гадоў. На Усходзе існуе старадаўняя прытча пра тое, што, вырашыўшы назаўжды пакінуць Зямлю і пасяліцца на Нябёсах, Буда паклікаў да сябе ўсіх жывёл свету. Але прыйшлі толькі 12, іх Буда і прызначыў заступнікамі кожнага луннага года. У 12-гадовым цыкле астралагічных «звяры» бясконца паўтараюцца ў наступным парадку: Пацук, Бык, Тыгр, Трус (Кот), Дракон, Змяя, Конь, Каза (Авечка), Малпа, Певень, Сабака і Кабан. Як бачым, у дачыненні да некаторых жывёл ёсць розначытанні. У прыватнасці, у Кітаі адным з 12 нябесных «звяроў» лічаць Труса, а ў Японіі і В'етнаме — Ката. Але характарыстык года гэта не мяняе.

На працягу аднаго чалавечага жыцця мы можам назіраць шасці-семіразовае паўтарэнне кожнага знака. Сутнасць усходняга гараскопа: заступнік года — простае і зразумелае тлумачэнне характару сіл Сусвету, якія ўплываюць у дадзены адрэзак часу на лёсы людзей, на глабальныя сусветныя падзеі і на тое, што адбываецца ў жыцці кожнага. Таксама заступнік года вызначае характар тых, хто нарадзіўся ў яго год.

**На стале ў навагоднюю ноч не павінна быць мяса труса. І наогул памятаем, што заступнік надыходзячага года — вегетарыянец. А таму ў любую навагоднюю страву важна дадаць агародніну (у першую чаргу моркву і капусту). У святочным меню абавязковыя садавіна, да месца будуць і ягады (напрыклад хутка замарожаныя), а таксама стравы і прысмакі з імі.**

Акрамя таго, кожны год праходзіць пад заступніцтвам адной са стыхій: Дрэва, Агонь, Зямля, Метал, Вада таксама змяняюцца па крузе. Такім чынам, за 60 гадоў сімвал стыхіі прыходзіць у жыццё чалавека каля 12 разоў. І, нарэшце, кожнаму году па ўсходнім гараскопе адпавядае свой колер. Колеры таксама змяняюцца па парадку, але раз у два гады запар: сіні (зялёны), чырвоны, жоўты, белы, чорны.

Заступнік 2023 года — менавіта чорны. Але хвалявацца наконт гэтага не варта. На Усходзе гэты колер мае, хутчэй, пазітыўнае значэнне. Трусік — вельмі інтэлектуальны задыякальны «звер» (чорны колер яшчэ і дадае яму артыстызму і вытанчанасці). Але пры гэтым ён не любіць неапраўданай рызыкі (уласна кажучы, наогул ніякай рызыкі не заахвочвае), а аддае перавагу спакою і руціне. Менавіта як руцінны і трэба правесці наступны год — не варта планаваць на яго ніякіх глабальных і раптоўных жыццёвых пераменаў, а таксама любых рэзкіх рухаў. Трус нясе з сабой супакаенне і жыццёвую мудрасць. Гэта час адбудоўваць сямейныя сувязі, нараджаць і выхоўваць дзяцей, удумліва і спакойна падымацца па кар'ернай лесвіцы, атрымліваць асалоду ад мернай плыні жыцця. Пагадзіцеся, гучыць нядрэнна — нават калі камусьці гэта падасца прэснаватым і сумным. Людзі, народжаныя ў год Труса, тактоўныя і акуратныя, клапатлівыя і ўважлівыя. Часам яны пазёры, але пры гэтым добрыя і прыязныя. Яны бываюць сентыментальныя і ранімыя, але зусім не безабаронныя: невыпадкова другое «аблічча» заступніка надыходзячага года — мяккі і пухнаты, але, калі трэба, зубасты і кіпцюрысты Кот. Так што выходзіць з зоны камфорту ў надыходзячым годзе часам прыйдзецца, але толькі для таго, каб яе пашырыць, абнадзейваюць астролагі.

На жыццё людзі, народжаныя ў год Труса, глядзяць цвяроза, планы строяць рэальныя і амаль заўсёды дабіваюцца свайго. У гараскопы і ўсякую містыку яны не вераць, пры гэтым, калі не хлусяць астролагі, карыстаюцца асаблівай падтрымкай Фартуны — лічыцца, што ў год Труса нараджаюцца шчаслівычкі. Дарэчы, Трус — дзеталюбівы бацька, і менавіта надыходзячы год ідэальны для папаўнення ў сям'і: Трус спрыяе цяжарным і маладым мамам. Ды і ўвогуле ўсім бацькам. Таму, каб заступнік года не адвярнуўся ад вас, у будучым годзе трэба старацца быць клапатлівымі і ўважлівымі бацькамі і прысвячаць час сваім дзецям — і маленькім, і тым, што падраслі, і тым, якія даўно выраслі. Роўна як і сваім бацькам, бабулям і дзядулям. Сям'я для Труса — адназначны прыярытэт.

У цэлым наступны год абяцае быць фінансава ўдалым для людзей, якія ўмеюць працаваць і маюць тое, «што можна прадаць» (гаворка ідзе аб прафесійных навыках і інтэлектуальных здольнасцях): заступнік года дапаможа ўсім, хто будзе вучыцца, расці прафесіянальна і «паляпшаць свае кампетэнцыі». Вам могуць прапанаваць добрую працу або вы атрымаеце шанц падняцца на новую прыступку кар'ернай лесвіцы. І, вядома, у надыходзячым годзе вельмі многіх чакаюць любоўныя раманы, усякія і розныя — службовыя, курортныя, раптоўнае пачуццё да, здавалася б, даўно знаёмага чалавека з вашага асяроддзя... І многія з гэтых раманаў скончацца маршам Мендэльсона — такі ўжо «характар» у надыходзячага года.

**Трусік любіць тульнасць, таму, каб прыцягнуць да сябе поспех у наступным годзе, перад навагодняй ноччу не залянуйцеся зрабіць прыборку.**

### ЯК СУСТРЭЦЬ СВЯТА?

Адназначна — з сям'ёй і/або з самымі блізкімі сябрамі. Трус не любіць выпадковых людзей, чужых кампаній і незнаёмых месцаў. Зрэшты, ён не інтраверт — шумная вечарынка таксама прыйдзецца яму па душы, але не з незнаёмцамі, а, напрыклад, у пашыранай версіі сям'і: з блізкімі і далёкімі сваякамі, магчыма, нават якія прыехалі з іншых гарадоў. «Новы год — сямейнае свята» пры сустрэчы 2023-га — аксіёма!



У гэты Новы год у любую святочную страву дадаём зеляніну і агародніну.

Трусік любіць грунтоўнасць, таму да яго сустрэчы варта падрыхтавацца загадзя. Зрэшты, у нас яшчэ ёсць фора — паводле ўсходняга гараскопа, у свае правы Трус цалкам уступіць толькі 22 студзеня. Да гэтага моманту важна:

- Па магчымасці пазбавіцца ад даўгоў. У ідэале — нават закрыць усе крэдыты. Гэта датычыцца, зрэшты, не толькі грашовых пытанняў: варта выканаць усе абяцанні і ўзятыя на сябе абавязацельствы, вярнуць у бібліятэку кнігі, а на працы і дома — завяршыць адкладзеныя ў «доўгую скрыню» справы.
- Намеціць канкрэтныя мэты на наступны год і зрабіць першыя крокі па іх увасабленні ў жыццё. Тады Трус дапаможа з іх дасягненнем.
- Абавязкова — памірыцца з усімі, з кім у сварцы. Асабліва калі гаворка пра сваякоў. Дараваць усе крыўды, каб не цягнуць іх у будучы год. Сюды ж адносіцца і неабходнасць патэлефанаваць або напісаць тым блізкім людзям, якія надоўга засталіся без вашай увагі.

Трусік любіць утульнасць, таму, каб прыцягнуць да сябе поспех у наступным годзе, перад навагодняй ноччу не залянуйцеся зрабіць прыборку. Колеры, у якіх Трусу спадабаецца навагодні дэкор, — спакойныя і глыбокія (смарагдавы, сіні, прыглушаны бардовы, фіялетавы, шакаладны) або далікатныя і пастэльныя (мятны, лавандавы, бледна-ружовы, усе адценні блакітнага, бэжавы), а таксама залатыя і сярэбраныя тоны. Старайцеся, каб тонаў падчас упрыгожвання ёлкі было не занадта шмат (не больш за тры-чатыры) — калі «мітусіцца ў вачах», гэта гісторыя не пра сёлетні Новы год. Трусік трохі пыхлівы — не забудзьцеся ўпрыгожыць ёлку і свой дом яго фігуркамі, гэта прыцягне поспех. Галоўная забарона і ў дэкоры, і ў навагоднім уборы — на «драпежныя» прынты, а таксама натуральны мех. Экафутра і модны дэкор з пёраў Труса не пакрыўдзяць. Усё гэта датычыцца і навагодняга вобраза: менш стракатасці, больш арыстакратычнасці, Трусік гэта ацэніць. Зрэшты, цяпер модныя стразы яму цалкам да душы.

**Трус нясе з сабой супакаенне і жыццёвую мудрасць. Гэта час адбудоўваць сямейныя сувязі, нараджаць і выхоўваць дзяцей, удумліва і спакойна падымацца па кар'ернай лесвіцы, атрымліваць асалоду ад мернай плыні жыцця.**

Зразумела, на стале ў навагоднюю ноч не павінна быць мяса труса. І наогул памятаем, што заступнік надыходзячага года — вегетарыянец. А таму ў любую навагоднюю страву важна дадаць агародніну (у першую чаргу моркву і капусту). У святочным меню абавязковыя садавіна, да месца будуць і ягады (напрыклад хутка замарожаныя), а таксама стравы і прысмакі з імі. У цэлым, Чорны Вадзяны Трус не адабрае абжорства, хоць і любіць «пажаваць». Бедны стол будзе яму не даспадобы, але ён з добразычлівасцю прыме не надта каларыйныя, карысныя для здароўя стравы (усе з маянэзам — не варыянт, агароднінныя салаты лепш запраўляць карыснымі расліннымі алеямі — напрыклад, рапсавым, аліўкавым, вінаградным). З сытных страў «зорная жывёла» надыходзячага года адобрыць морапрадукты, рыбу, а таксама курыцу, індычку, не занадта каларыйную свініну. Да гарачага на навагоднім стале павінен быць гарнір з запечанай гародніны (бо Трус — не аматар бялковай дыеты). Гэта можа быць, напрыклад, бульба, гарбуз або капуста. І паболей свежай зеляніны! Кроп, пятрушка, зялёная цыбуля, кінза, ліставая салата — усё гэта будзе дарэчы. А абавязковай «прыправай» да святочнай трапезы павінна быць сяброўская гутарка, атмасфера цяпла і ўзаемаразумення, якая пануе за сталом. Астролагі абяцаюць нам самы шчаслівы год у апошнім дванаццацігадовым цыкле. Давайце гэта святкаваць!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «ТОРФОБРИКЕТНЫЙ ЗАВОД ДИТВА»**

**Аукцион состоится 30.01.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 420/D-117510 (назначение: специальное жилое помещение, наименование: помещение гостиницы), общей площадью 142,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, аг. Дитва, ул. Первомайская, д. 5, пом 4.** Лот № 1: расположен на земельном участке, кадастровый № 423683202625000023, площадью 0,3503 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: аг. Дитва, ул. Первомайская, 5 Дитвянского сельсовета |
| **Начальная цена продажи** | 100 920 руб. (сто тысяч девятьсот двадцать) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 10 092 руб. (десять тысяч девяносто два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 26.01.2023 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу.**

**Аукцион состоится 31.01.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-22653 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 14), общей площадью 64,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 98.** Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425400000001000064 (целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений (магазина)), площадью 0,0327 га по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 98 |
| **Начальная цена продажи** | 36 487,31 руб. (тридцать шесть тысяч четыреста восемьдесят семь рублей тридцать одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 648 руб. (три тысячи шестьсот сорок восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 27.01.2023 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 17 января 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % (лоты №№ 1–9, 12); на 60 % (лоты №№ 10, 11, 13, 14) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2 | | | |
| **1** | Емкость для латекса (инв. № 142-6030) | 6 480,00 | **648,00** |
| **2** | Емкость для латекса (инв. № 142-6031) | 6 480,00 | **648,00** |
| **3** | Емкость для латекса (инв. № 142-6032) | 6 480,00 | **648,00** |
| **4** | Емкость для латекса (инв. № 142-6033) | 6 480,00 | **648,00** |
| **5** | Емкость для латекса (инв. № 142-6034) | 6 480,00 | **648,00** |
| **6** | Емкость для латекса (инв. № 142-6035) | 6 480,00 | **648,00** |
| **7** | Емкость для латекса (инв. № 142-6036) | 6 480,00 | **648,00** |
| **8** | Емкость для латекса (инв. № 142-6037) | 6 480,00 | **648,00** |
| **9** | Емкость для латекса (инв. № 142-6038) | 6 480,00 | **648,00** |
| **10** | Передвижная раскройная машина CS-532/18-2 (инв. № 142-42901) | 96,00 | **9,60** |
| **11** | Раскройная ленточная машина OSHIMA OB-900A/c (инв. № 142-43058) | 2 256,00 | **225,60** |
| **12** | Токарно-винторезный станок МК-6056 (инв. № 142-42579) | 4 440,00 | **444,00** |
| **13** | Сплит-система холодильная (инв. № 230-3941) | 480,00 | **48,00** |
| **14** | Сплит-система холодильная СВ 216 SF (инв. № 230-3946) | 576,00 | **57,60** |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 декабря 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 января 2023 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах.

В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 29.10.2022 г. № 213 (29835), от 22.06.2022 г. № 120 (29742).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 600537220

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Логойским сельским исполнительным комитетом (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

